**В. Меляшкевіч**

# БЕЗЭКВІВАЛЕНТНЫЯ ФРАЗЕАЛАГІЧНЫЯ АДЗІНКІ З СЕНСАНІМІЧНЫМІ САМАТЫЗМАМІ Ў БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙМОВАХ

Мэта даследавання – выявіць тыпалагічныя падабенствы і спеціфіку безэквівалентных фразеалагічных адзінак (ФА) з сенсанімічнымі саматызмамі і спосабы іх рэпрэзентацыі ў беларускай і англійскай мовах.

Актуальнасць дадзенай тэмы заключаецца ў важнасці правільнага ўжывання безэквівалентных ФА ў практыцы беларуска-англійскай камунікацыі.

Са “Слоўніка фразеалагізмаў беларускай мовы” І. Я. Лепешава і “Англа-рускага фразеалагічнага слоўніка” А. В. Куніна было выбрана 18 беларускіх і 8 англійскіх ФА з саматычнымі кампанентамі, якія можна кваліфікаваць безэквівалентнымі.

Безэквівалентныя ФА з сенсанімічнымі саматызмамі падзяляюцца на наступныя групы:

1) ФА, у аснове якіх адлюстроўваюцца ўяўленні аб асаблівасцях культуры, паводзін, жыцця беларусаў або англічан: бел. *вешаць нос/насы на квінту*, *з п’яных вачэй/воч*, *залiваць вочы* і англ. *a private eye*;

2) ФА, матываваныя назіраннямі за мімікай, жэстамі: бел. *лыпаць вачыма* і англ. *have one’s nose in a book*;

3) ФА, якія ўяўляюць нядобразычлівыя пажаданні: бел. *ціпун на язык*, *каб язык адсох*, *соль у вочы, папоўскае вока* і англ. *God damn one’s eyes!*;

4) ФА, заснаваныя на этыкетных установках: бел. *выбіраць вочы, выядаць вочы*, *выкідаць на вока*, *плюнуць у вочы*, *замазаць вочы, замыльваць вочы, сляпіць вочы, туманіць вочы* і англ. *a black eye*;

5) ФА, якія выражаюць імператыўны характар: бел. *разуй вочы*;

6) ФА, якія паходзяць з мастацкай літаратуры: англ. *a sight for sore eyes*;

7) ФА, у якіх адлюстраваліся пэўныя важныя моманты спартыўных гульняў (баскетбола, футбола, бокса) ці стан спартсменаў: англ. *box smb.’s ears*, *have one’s eye on the ball*. Англія лічыцца радзімай многіх спартыўных гульняў (гольф, кёрлінг, крыкет, сквош, футбол), што, безумоўна, з’яўляецца падставай гонару англічан.

Безэквівалентныя ФА з сенсанімічнымі саматызмамі адлюстроўваюць унікальнасць культуры нацыі, спецыфічныя асаблівасці матэрыяльнага і духоўнага жыцця народа.